з моладдзю. Фарміруючы прафесійныя якасці студэнта, выкладчык вышэйшай навучальнай установы стварае ўмовы для выхавання канкурэнтаздольнага настаўніка, які на рынку працы заўсёды знойдзе сваё месца і будзе задаволены сваёй дзейнасцю.

Адным з прадуктыўных спосабаў падрыхтоўкі ўзаемадзеяння студэнтаў з аб'ектам будучай дзейнасці з'яўляюцца творчыя практыкаванні. У праграму нашага даследавання былі ўключаны заданні-задачы па развіццю музычна-слыхавых уяўленняў, памяці, эмацыянальнай спагадлівасці і фантазіі. Гэта форма работы з'явілася адносна самастойнай, таму што грунтавалася на назапашаным вопыце студэнта і садзейнічала свабоднаму, нефармальнаму дыялагічнаму педагагічнаму ўзаемадзеянню выкладчыка і студэнта. У выніку дасягалася паступовае ўсведамленне студэнтам сваіх магчымасцей, рыс характару, якія адпавядаюць патрабаванням прафесіі. На іх аснове ствараліся ўмовы здзяйснення самакантролю, самаарганізацыі, самаўдасканалення.

Сітуацыі ўнутранай эмацыянальна-інтэлектуальнай напружанасці стымулявалі патрэбнасць у пераадоленні ўласных недахопаў і цяжкасцей. Заданні размяркоўваліся як па накірунках творчага мыслення, так і па ўзроўню прадуктыўнасці дзейнасці. Мы распрацавалі наступную класіфікацыю заданняў і практыкаванняў.

I. Практыкаванні на развіццё музычна-слыхавога і музычна-рытмічнага кантролю з апорай на музычную памяць. Тут прапаноўваліся такія заданні:

- падбор на слых знаёмых мелодый;
- пазіцыйнае транспанаванне адна ці двухгалосых песенных меладычных урыўкаў;
- жанравыя пераўтварэнні па зададзеных меладычных рысунках.

II. Практыкаванні на фарміраванне музычна-рэпрадуктыўных здольнасцей. Выканальніцкія і асацыятыўныя перажыванні зместу былі накіраваны на развіццё спецыфічнай чуллівасці да сродкаў музычнай выразнасці.

III. Практыкаванні на ўстанаўленне прыродаадпаведных сувязей і заканамернасцей. Мэтай заданняў было фарміраванне ўласных варыянтаў інтэрпрэтацыі музычных карцін нашага жыцця: вобразаў прыроды, бытавых, партрэтных замалёвак і казачных персанажаў.

IV. Практыкаванні, накіраваныя на развіццё творчай фантазіі, цікавасці да імправізацыі. Тут прапаноўваўся наступны матэрыял:

– завяршэнне мелодый;
– песеннае афармленне паэтычных урыўкаў;
-- падбор падгалоскаў і акампанементу.

Лёгкасць і даступнасць засваення матэрыялу задач спрыялі канцэнтрацыі ўвагі студэнта і выкладчыка на працэсе актыўнай творчасці.

Інтэрв'юіраванне студэнтаў у канцы першага этапа навучання выявіла залежнасць паміж узроўнем развіцця творчых здольнасцей і крытычным стаўленнем да вучэбнай дысцыпліны і творчага стылю педагагічнай дзейнасці.

У далейшым пры сумесным падборы рэпертуару і працы над матэрыялам мы выдзялялі элементы творчага стылю дзейнасці студэнтаў: арыгінальнасць, варыятыўнасць, нестандартнасць мыслення, лёгкасць асацыіравання, здольнасць да ацэначных меркаванняў, гатоўнасць памяці.

**Трамбіцкі У.У.,**
ст. выкладчык

## УПЛЫЎ НЕВЕРБАЛЬНАЙ ІНФАРМАЦЫІ НА ЗДОЛЬНАСЦІ СТУДЭНТА

Студэнт – чалавек, у сістэме каштоўнасцей якога асноўнымі элементамі з'яўляюцца веды. Гэта не значыць, што, акрамя ведаў, студэнту нічога не трэба. Калі ў яго свядомасці пачынаюць пераважаць іншыя каштоўнасці, ён можа страціць якасць студэнта. Студэнт, як і любы другі чалавек, многаўзроўневая істота: біялагічная, псіхалагічная, біяхімічная, біяфізічная і г.д. З пункту гледжання філасофіі, сацыялогіі і псіхалогіі, студэнт уяўляе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цікавасць як аб'ект і суб'ект сацыякультурнай дзейнасці.

Навейшыя дасягненні эталогіі дазваляюць зрабіць вывад, што нават жывёлы не заўсёды прытрымліваюцца генетычна замацаванага ўзору паводзін, а маюць свой «жыццёвы вопыт», які перадаецца з пакалення ў пакаленне праз біясацыяльныя сістэмы, што дазваляе вар'іраваць паводзіны ў залежнасці ад навакольных умоў. Адзін з новых напрамкаў у філасофіі (біяпалітыка) не апошнюю ролю адводзіць невербальным камунікацыям (агрэсіі, сексуальным адносінам). Але біяпалітыка (як і сацыябіялогія) выдзяляе ў культуры не толькі сацыяльны, але і біялагічны кампаненты.

Улічваючы розныя шляхі перадачы інфармацыі ў сістэме культуры, можна прапанаваць варыянты ўдасканалення адносін паміж людзьмі і сацыяльнымі структурамі. Апошнія могуць садзейнічаць рэалізацыі здольнасці студэнта і фарміраванню новых, сацыяльна значных якасцей у студэнта. Для гэтай мэты неабходны саюз з мікрабіялогіяй, экалогіяй, біяэнергетыкай.

Невербальная інфармацыя на здольнасці студэнта ўплывае наступным чынам:

1) студэнт пачынае звяртаць больш увагі не на словы, існуючыя правы і нормы паводзін, а на рэальныя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве і вучэбным працэсе;

2) студэнт бачыць і тое, што адны і тыя ж сацыяльныя ўмовы фарміруюць у розных людзей розныя чалавечыя якасці;

3) самыя лепшыя здольнасці студэнтаў без адпаведных знешніх умоў рэалізавацца не могуць; гэта з'ява можа прывесці да затухання патэнцыяльных здольнасцей, у сувязі з чым «страсць развіцця» асобы страчваецца.

4) студэнт лепш запамінае не «добрыя» словы, а тое, што вядзе да поспеху; але калі няма прапарцыянальных адносін паміж пачуццём і розумам, можа ўзнікнуць безразважная дабрыня або бессэнсоўная ўдзячнасць;

5) на чалавека (у тым ліку студэнта) невербальная інфармацыя ўплывае праз «біялагічную эвалюцыю», у выніку якой ідзе працэс паляпшэння біялагічных і эмацыянальных якасцей.

Роля вербальнай інфармацыі рэзка ўзрастае на ўзроўні сацыяльна-тэхнічнага развіцця чалавека і грамадства. Аднак на гэтым узроўні адбываецца замаруджванне біялагічнай эвалюцыі, што вядзе да наступных сацыяльных вынікаў: у грамадстве пачынаюць дамінаваць не самыя лепшыя асобы; паяўляюцца лідэры з яскрава выяўленымі агрэсіўнымі якасцямі.

Веды аб тым, што невербальная інфармацыя аказвае ўплыў як на сацыяльныя працэсы ў цэлым, так і на здольнасці студэнтаў, дазваляюць прапанаваць варыянты паляпшэння ўзаемаадносін паміж людзьмі. У якасці такіх варыянтаў могуць выступаць:

1) прапаганда і правядзенне спаборніцтваў, што вядзе да сублімацыі агрэсіі;

2) пазбяганне дзялення індывідаў на «сваіх» і «чужых». Такое дзяленне назіраецца і на дасацыяльным узроўні. Маладыя гусі ўжо «ведаюць», што ўсё рыжае, вялікае і пушыстае ўяўляе для іх небяспеку. На сацыяльным узроўні падобныя стэрэатыпы дапаўняюцца нацыянальнымі, расавымі, палавымі, класавымі і іншымі ўяўленнямі.

У якасці сацыяльных тэхналогій для паляпшэння міжнацыянальных зносін можна прапанаваць:

- часцей праводзіць дзіцячыя і юнацкія міжнацыянальныя кантакты, якія будуць садзейнічаць ліквідаванню існуючых стэрэатыпаў;

- у студэнцкіх групах практыкаваць вылучэнне лакальных (часовых) лідэраў.

Дасягненні ў галіне псіхалогіі сведчаць аб тым, што здольнасці чалавека не могуць абмяжоўвацца рамкамі адной спецыяльнасці або дзейнасці. Гэта пацвярджае living рознабаковая дзейнасць геніяў. Вось чаму ў якасці сацыяльнай тэхналогіі для паляпшэння чалавечых зносін (у тым ліку міжнацыянальных) могуць выступаць узаемаадносіны, якія стымулююць дзейнасць усіх.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ